НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СЕМАНТЫКА ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОЎ (культурна-гістарычны аспект)

Н. П. Пятрова (г. Магілёў, Беларусь)

Беларуская і руская мовы ў Беларусі з'яўляюцца дзяржаўнымі і абавязковымі для вывучэння ў школах рэспублікі. Іх выкладанне адбываецца ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму, пры гэтым вывучэнне беларускай мовы і авалоданне беларускай культурай рускамоўным насельніцтвам Беларусі выклікае пэўныя цяжкасці.

Лінгвакраіназнаўства з'яўляецца актуальным не толькі ў практыцы выкладання і вывучэння мовы як замежнай, але можа быць вельмі карысным і для тых, хто вывучае другую мову ва ўмовах дзвюхмоўя. У межах лінгвакраіназнаўчага падыходу да выкладання і вывучэння мовы як замежнай неабходным з'яўляецца вывучэнне семантыкі моўных адзінак з мэтай засвойвання іх зместу, адценняў і канатацый на ўзроўні, максімальна набліжаным да іх успрымання носьбітамі дадзенай мовы і культуры.

Беларусь і Расія вельмі блізкія не толькі геаграфічна, але і ў культурна-гістарычным плане, што яскрава адлюстравана ў нацыянальна-культурнай семантыцы беларускай і рускай моў. На прыкладзе фразеалагізмаў можна вылучыць агульнае і спецыфічнае ў нацыянальна-культурнай семантыцы беларускай і рускай моў.

Агульнаславянскі пласт знайшоў сваё адлюстраванне ў шматлікіх фразеалагізмах. Напрыклад:

фразеалагізм *перабіраць (перабраць; разбіраць, разабраць) па косточках* са значэннем 'асуджаць чые-н. недахопы, абмяркоўваць каго-н.' [2, с. 299] – у бел. м.;

фразеалагізм *перемывать (перемыть) косточки (кому)* са значэннем 'абгаворваць, займацца плёткамі, абмяркоўваць каго-н.' [1, с. 349] – у рус. м.

Узнікненне гэтых выразаў звязана са старажытнаславянскім язычніцкім абрадам "паўторнага пахавання". Звычайна праз тры гады пасля пахавання магіла раскопвалася з той мэтай, каб упэўніцца быў ці не быў нябожчык пры жыцці звязаны з ведзьмакамі, пярэваратнямі, а таксама зняцця з яго закляцця і ачышчэння ад грахоў. Перад тым як зноў закапаць нябожчыка, яго родзічы і сваякі перабіралі косці, перамывалі іх вадой або віном. Перамыванне касцей нябожчыка, па ўяўленням нашых продкаў, вызваляла грэшніка ад закляцця, у тым выпадку, калі ён не паспеў перад смерцю раскаяцца. Пры перамыванні костачак не абыходзілася без ацэнкі нябожчыка, яго характару, паводзін, г.зн. без абгаворвання. Таму паступова сам абрад сталі звязваць з абмеркаваннем каго-н., крытыкай чыіх-н. недахопаў.

Культ язычніцкай багіні ўрадлівасці, вады, дажджу, заступніцы мацярынства Мокашы таксама пакінуў свой след у фразеалогіі беларускай і рускай моў. Дзень багіні Мокашы, пятніца, быў днем, вольным ад працы. У гэты дзень было забаронена прасці, мыць дзяцей, пачынаць якую-небудзь справу і г.д. Хрысціянства перанесла ўсе атрыбуты Мокашы на дзень Св. Параскевы Пятніцы. У пятніцу трэба было пасціць, памінаць памерлых.

На Беларусі гэта традыцыя захоўвалася вельмі доўгі час, пра што сведчыць фразеалагізм *хоць у пятніцу*, які ўжываецца пры словах *замуж, жаніць* і мае значэнне 'у любы момант, у самы блізкі час' [2, с. 399]. Першапачатковы сэнс выразу — 'хоць у той дзень, калі не дазвалялася спраўляць вяселле' (вясельным днём была нядзеля).

Рускія людзі верылі, што матушка Пятніца гневаецца на тых, хто ў яе дзень працуе. Пра гультаёў сталі казаць, што ў іх *семь пятниц на неделе* (у рус. м.). Цяпер так кажуць пра таго, хто часта зменьвае сваі рашэнні, меркаванні [1, с. 586-587].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Посным днем была не толькі пятніца, але і серада, што не адлюстравана ў рускіх фразеалагізмах, але зафіксавана ў беларускіх. Напрыклад:

фразеалагізм *серада з-пад пятніцы (відаць, вылазіць)* са значэннем 'ніжняе адзенне з-пад верхняга (відаць і інш.)' [2, с. 344] – назоўнікавыя кампаненты ў гэтым выразе звязаны адзін з ніжнім адзеннем, а другі з верхнім;

фразеалагізм *як серада на пятніцу (крывіцца, касіцца)* са значэннем 'з вялікім незадавальненнем, болем і пад.': [2, с. 439].

Сучасніку ўжо невядома, чаму ў выразах *серада з-пад пятніцы, як серада на пятніцу* менавіта гэтыя дні абралі для параўнання, але яшчэ на пачатку XX ст. выраз не быў загадкавым, бо быў звязаны з посымі днямі, устаноўленымі царквой. Есці мясное і малочнае забаранялася не толькі ў пасты, але і ў сераду і пятніцу амаль кожнага тыдня. Атрымлівалася, што і ў сераду чалавек не пад'еў як след, а тут на носе такая ж «сухая» пятніца. Адсюль і параўнанне: *скрывіўся як серада на пятніцу*. Трэба улічваць і тое, што ў пятніцу пасцілі больш строга, чым у сераду, таму серада мела падставы "крыўдаваць, крывіцца на пятніцу". З гэтымі посымі днямі звязана ўзнікненне і такіх зваротаў: *зморшчыўся як сухая пятніца; не бяда, што без рыбы серада.*

Адгалосак часоў Кіеўскай Русі захаваўся ў семантыцы беларускага фразеалагізму *на паповы сані (збірацца)* са значэннем 'памірацъ' [2, с. 242]. У даўнія часы звычайна нябожчыка адвозілі да месца пахавання на санях у любую пару года. Выраз фіксуецца таксама і з іншымі кампанентамі і з іншым значэннем: (выхаваў) *на паповы сані* – 'смерць', *глядзець на паповы сані* – 'вельмі кепска пачуваць сябе (пра хворага), рыхтавацца да смерці'.

Успамін пра забарону паўторнага шлюбу для святароў сустракаецца ў беларускай мове: фразеалагізм *апошняя ў папа жонка* ўжываецца як рэакцыя суразмоўніка на слова *апошні* . Досціп фразеалагізма ў тым, што ў папа жонка заўсёды першая і апошняя. [2, с. 39].

Рускі народ у адносінах да свяшчэннікаў звярнуў увагу на іншыя рэаліі. Фразеалагізм *пьяный как поп на паску/пасху* са значэннем 'вельмі п'яны' адлюстроўвае іранічныя адносіны да паводзін служыцелей праваслаўнай царквы ў найбольш паважанае хрысціянскае свята. Пра неразумнага чалавека кажуць: *умен как поп Семён* [1, с. 558].

Параўнальны аналіз нацыянальна-культурнай семантыкі фразеалагізмаў беларускай і рускай моў дазваляе вылучыць сярод іх некалькі груп з улікам супадзення ці не супадзення іх нацыянальна-культурнага кампанента.

У першую групу можна аб'яднаць фразеалагізмы з супадзеннем нацыянальна-культурнай семантыкі, г.зн. у іх адлюстраваны агульныя для гісторыі і культуры Беларусі і Расіі падзеі, з'явы, вераванні, абрады і г.д., параўн.:

перемывать/перемыть косточки (у рус. м.) – *перамываць /паласкаць/ апалоскваць костачкі* (у бел. м.),

семь пятниц на неделе (у рус. м.) – *хоць у пятніцу* (у бел. м.).

У другую групу ўваходзяць фразеалагізмы, у якіх зафіксаваны агульныя для народаў Беларусі і Расіі рэаліі, але якія атрымалі розную ацэнку і пераасэнсаванне, параўн.:

пьяный как поп на паску/пасху (у рус. м.) – *апошняя ў папа жонка* (у бел. м.).

Трэцяя група ўключае нацыянальна маркіраваныя фразеалагізмы, найбольш каштоўныя з боку лінгвакраіназнаўства, у якіх згадваюцца факты, з'явы, уяўленні, якія захаваліся толькі ў адной з блізкароднасных моў. Напрыклад, серада як посны дзень згадваецца пераважна ў беларускіх фразеалогізмах, параўн.:

серада з-пад пятніцы (відаць, вылазіць) (у бел. м.),

як серада на пятніцу (крывіцца, касіцца) (у бел. м.).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Успамін пра звычай адвозіць памерлага да месца пахавання на санях захаваўся толькі ў беларускай мове, параўн.:

на паповы сані (збірацца) (у бел. м.).

Такім чынам, параўнальнае вывучэнне семантыкі фразеалагізмаў рускай і беларускай моў істотна дапаўняе прадстаўленне аб агульным і розным у нацыянальна-культурнай семантыцы блізкароднасных моў і з'яўляецца неабходнай ўмовай для распрацоўкі лінгвакраіназнаўчага накірунку выкладання гэтых моў ва ўмовах білінгвізму.

Літаратура

1. *Бирих, А.К.* Русская фразеология : историко-этимологический словарь / А.К. Бирих, В.М. Мокиенко, Л.И. Степанова; под ред. В.М. Мокиенко. – М.: Астрель: АСТ: Люкс, 2005. – 926 с.

2. *Лепешаў, І.Я.* Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2004. – 448 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.